**Назва вучэбнай дысцыпліны:**
**“Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”**

| | |
|---|---|
| **Код і найменне спецыяльнасці** | 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура |
| **Курс навучання** | 4 |
| **Семестр навучання** | 8 |
| **Колькасць аўдыторных гадзін:** | 50 |
| **Лекцыі** | 24 |
| **Семінарскія заняткі** | |
| **Практычныя заняткі** | 26 |
| **Лабараторныя заняткі** | |
| **Форма прамежкавай атэстацыі (*залік/ дыферэнцыраваны залік/экзамен)*** | залік |
| **Колькасць заліковых адзінак** | 3 |
| **Кампетэнцыі, якія фарміруюцца** | СК-13. Выконваць гістарычнае каментаванне фанетычных, марфалагічных і сінтаксічных асаблівасцей сучаснай беларускай мовы. |

**Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны:**

Гісторыя беларускай літаратурнай мовы вывучае мову перш за ўсё ў яе пісьмовым афармленні. Мэта дысцыпліны – пазнаёміць з гісторыяй фарміравання, развіцця і ўдасканалення беларускай літаратурнай мовы. Само ўзнікненне і развіццё беларускай літаратурнай мовы разглядаецца як вынік з'яўлення беларускай літаратуры, пашырэння беларускага друкаванага слова, што вяло не толькі да ўзбагачэыня лексікі і фразеалогіі, але і вымагала афармлення і выпрацоўкі літаратурных нормаў.

Задачы гісторыі беларускай літаратурнай мовы – паказаць, як адбывалася станаўленне літаратурнай мовы з уласцівай ёй функцыянальна-стылявой дыферэнцыяцыяй і адпаведнай сістэмай моўна-выяўленчых сродкаў; чым характарызаваліся асобныя яе стылі ў розныя гістарычныя эпохі; якія суадносіны існавалі паміж літаратурнай мовай і дыялектамі, а таксама літаратурнымі мовамі іншых народаў – найперш суседніх; як адбывалася ўпарадкаванне, нармалізацыя і кадыфікацыя; якую ролю ў працэсе станаўлення літаратурнай мовы адыгрывалі пісьменнікі, грамадскія дзеячы, навукоўцы.